Н43
БИБЛИОТЕКА БГУ

www.gazeta.bsu.by

БДУ

# УНІВЕРСІТЭТ

Газета Беларускага дзяржаўнага універсітэта

10 лютага 2009 года, № 2 (1995)

ПОСТФАКТУМ

## ДА ДНЯ БЕЛАРУСКАЙ НАВУКІ

**Уручаны доктарскія дыпломы і прафесарскія атэстаты**

Да Дня беларускай навукі прэзідэнт нашай краіны Аляксандр Лукашэнка па традыцыі ўручыў доктарскія дыпломы і прафесарскія атэстаты навуковым і навукова-педагагічным работнікам. У тым ліку дыплом доктара навук атрымаў загадчык кафедры археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін гістарычнага факультэта БДУ *Аляксандр Егарэйчанка*, а атэстаты прафесара ўручаны *Валерыю Беняш-Крыўцу* (кафедра вышэйшай алгебры механіка-матэматычнага факультэта БДУ) і *Тацціяне Вальнец* (кафедра рускай мовы філалагічнага факультэта БДУ).

**Адзначаная работа шэрага навукоўцаў БДУ**

За асабісты творчы ўклад у рэалізацыю касмічных праграм і праектаў Знакам Гагарына Федэральнага касмічнага агенцтва Расійскай Федэрацыі ўзнагароджаны рэктар БДУ член-карэспандэнт НАН Беларусі прафесар *Сяргей Абламейка*.

Ганаровай граматай Нацыянальнай акадэміі навук нашай краіны ўзнагароджаны прафесар *Яўген Варапай*, Ганаровай граматай Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях – прафесар *Мікалай Шумейка*, Ганаровай граматай Рэспубліканскага фонду фундаментальных даследаванняў узнагароджаны прафесар *Віктар Краснапрошын*, а граматы Міністэрства адукацыі ўдастоеная прафесар *Ірына Ратнікава*.

Акрамя таго, 10 ганаровых грамат і грамат БДУ ўручаныя 26 студзеня на ўрачыстым пасяджэнні Вучонага савета, прысвечаным Дню беларускай навукі.

**Змяніўся парадак прысуджэння прэмій БДУ імя У. Пічэты і А. Сеўчанкі**

Рашэннем Вучонага савета БДУ па прапанове рэктара прафесара Сяргея Абламейкі ўнесены змяненні ў Палажэнне аб прысуджэнні прэмій Белдзяржуніверсітэта імя У. Пічэты і А. Сеўчанкі. Цяпер адпаведны конкурс сярод навукоўцаў на найлепшую даследчыцкую працу ў галіне гуманітарных і прыродазнаўчых навук будзе праводзіцца штогадова, а памер матэрыяльнага заахвочвання павялічаны да 150 базавых велічынь.

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**

УШАНАВАННЕ

## СТЫПЕНДЫЯТЫ ПРЭЗІДЭНТА

***Прызначаны стыпендыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь на 2009 год аспірантам і маладым навукоўцам БДУ.***

Такую ўвагу заслужылі аспіранты: *Кацярына Герасімовіч* (філфак); *Міхаіл Прахаровіч* (мехмат); *Маргарыта Фабрыкант* (ФФСН); *Канстанцін Казадаеў* (ФРіЭ) і *Ксенія Ермаліцкая* (фізфак). Памер стыпендыі вызначаны ў 25 базавых велічынь.

Сярод маладых навукоўцаў БДУ стыпендыю кіраўніка дзяржавы сёлета будуць атрымліваць: доктар сацыялагічных навук *Дзмітрый Бязнюк* – за стварэнне метадалогіі комплекснага сацыялагічнага аналізу сацыядынамікі ўзаемадзеяння беларускай дзяржавы і рэлігійных арганізацый; кандыдат юрыдычных навук *Сяргей Калінін* – за распрацоўку і ўкараненне канцэпцыі, метадалогіі і метадычні правядзення Беларускай студэнцкай юрыдычнай алімпіяды; за абгрунтаванне кірункаў развіцця нацыянальнай сістэмы права і за актыўны ўдзел у нарматворчай дзейнасці Рэспублікі Беларусь; кандыдат фізіка-матэматычных навук *Кірыл Каплеўскі* – за прынцыпова новыя навуковыя вынікі, атрыманыя ў галіне фатонікі поліметынавых фарбавальнікаў, арыгінальныя распрацоўкі ў галіне навуковага прыборабудавання і мадэрнізацыі наяўнай спектраметрычнай апаратуры; кандыдат біялагічных навук *Васіль Грынёў* – за ўклад у распрацоўку айчыннага імпартазамяшчальнага супрацьпухліннага лекавага прэпарата "Гідроксікарбамід"; кандыдат біялагічных навук *Тацціяна Кулагава* – за распрацоўку метаду маніторынгу функцыянальнай актыўнасці астрагліяльных клетак; малады фізік *Міхаіл Цівaноў* – за распрацоўку фізіка-хімічных асноў тэхналогіі стварэння высокаэфектыўных сонечных элементаў.

**Стыпендыі для дактароў навук вызначаны ў памеры 1 562 400 руб., для кандыдатаў – 1 171 800 руб., для маладых навукоўцаў без ступені – 976 500 руб. у месяц.**

**Паводле інфармацыі НДЧ-ГУН**

## СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

**ДЗЕЦІ – БУДУЧЫНЯ КРАІНЫ**

Аб матэрыяльнай дапамозе студэнтам, што выхоўваюць дзяцей

**Стар. 2**

**"МАТЭМАТЫКА – НІБЫТА КАРАЛЫ"**

Выбітнаму вучонаму, доктару фізіка-матэматычных навук прафесару Пятру ЗАБРЭЙКУ споўнілася 70 гадоў

**Стар. 3**

**ВЭБ-ЖУРНАЛІСТЫКА НА ШВЕДСКІ КАПЫЛ**

Выкладчыкі і навучэнцы Інстытута журналістыкі атрымлівалі новыя веды на семінары ў Швецыі

**Стар. 4**

ДАСЯГНЕННІ

## САДРУЖНАСЦЬ АДЗНАЧЫЛА САЮЗ

***Студэнцкі саюз БДУ быў узнагароджаны дыпломам за вялікую работу ў Садружнасці студэнцкіх і моладзевых арганізацый, значны ўклад ва ўмацаванне і развіццё гуманітарнага супрацоўніцтва краін СНД.***

Дыплом падпісаны старшынёй Выканаўчага камітэта СНД С. Лебедзевым, прэзідэнтам Еўразійскай асацыяцыі універсітэтаў, рэктарам МДУ імя М. Ламаносава В. Садоўнічым, старшынёй Каардынацыйнага савета Садружнасці студэнцкіх і моладзевых арганізацый І. Ільіным.

З моманту стварэння Студсаюза БДУ вядзецца праца па пашырэнні міжнародных студэнцкіх кантактаў і інтэграцыі ў міжнародную студэнцкую прастору. Прадстаўнікі арганізацыі неаднаразова прымалі ўдзел у падрыхтоўцы рэзалюцый з'ездаў, канферэнцый, круглых сталоў, якія праводзяцца па ініцыятыве Садружнасці, выступалі з дакладамі на пленарных пасяджэннях, станавіліся мадэратарамі секцый. Таму дадзеная ўзнагарода – высокая ацэнка дзейнасці арганізацыі.

Пасля стварэння Садружнасці студэнцкіх і моладзевых арганізацый, якая аб'ядноўвае міжуніверсітэцкія і міжрэгіянальныя грамадскія рухі, студэнцкія і моладзевыя арганізацыі найбуйнейшых ВНУ дзяржаў-удзельніц СНД, Студэнцкі саюз актыўна ўключыўся ў яе работу. Усё пачалося з удзелу ў арганізацыі і правядзенні II з'езда Садружнасці студэнцкіх і моладзевых арганізацый "Міжнародны студэнцкі форум", які адбыўся 28 студзеня – 2 лютага 2007 г. на базе Беларускага дзяржаўнага універсітэта.



19–20 красавіка 2007 г. на X з'ездзе Еўразійскай асацыяцыі універсітэтаў у МДУ імя М. Ламаносава старшыня Студсаюза Анастасія Гвардзіян стала членам Савета Еўразійскай асацыяцыі універсітэтаў.

Пры непасрэдным удзеле Студэнцкага саюза Белдзяржуніверсітэта праходзіць шэраг важных моладзевых мерапрыемстваў на прасторы СНД: з'езды Садружнасці студэнцкіх і моладзевых арганізацый, фестываль моладзевай творчасці "Садружнасць талентаў" і інш.

Удзел у Міжнароднай канферэнцыі "Ламаносаў", форумах лідараў студэнцкіх і моладзевых арганізацый СНД і шматлікіх іншых мерапрыемствах дазволіў азнаёміцца з актуальнымі праблемамі студэнцкай моладзі ў краінах СНД і магчымасцямі іх вырашэння, спрыяе інтэграцыі ў міжнародны студэнцкі рух, наладжванню кантактаў і абмену інфармацыяй з прадстаўнікамі студэнцкага самакіравання краін-удзельніц СНД, набыццю досведу работы ВНУ краін СНД у галіне гуманітарнага супрацоўніцтва, укараненню гэтага досведу ў работу органаў студэнцкага самакіравання БДУ.

Вынікі працы ў Садружнасці студэнцкіх і моладзевых арганізацый выкарыстоўваюцца ў арганізацыі падобных мерапрыемстваў, якія праводзяцца ў нашым універсітэце: Міжнародны выязны адукацыйны семінар для рэдкалегій студэнцкіх газет "Зімовая школа студэнцкай журналістыкі" (15–17 лютага 2008 г.), Міжнародная студэнцкая навукова-практычная канферэнцыя "Урок цаною лёсаў", прысвечаная святкаванню Дня Перамогі (2–3 мая 2008 г.).

**Дар'я ПРЫШЧЭПАВА**

## ВЕСТКІ З РЭКТАРАТА

САВЕТ па праблемах інфарматызацыі створаны ў БДУ. Яго ўзначаліў рэктар прафесар Сяргей Абламейка. Савет закліканы каардынаваць дзейнасць падраздзяленняў БДУ, якія ўдзельнічаюць у інфарматызацыі навучальнага працэсу, навуковых даследаванняў і сістэмы кіравання; зацвярджаць патрабаванні да адукацыйных інфармацыйных рэсурсаў, што распрацоўваюцца ў БДУ, і інш.

ПЫТАННІ міжвузаўскага супрацоўніцтва абмеркавалі 5 лютага на сустрэчы ў Мінску кіраўніцтва БДУ і прарэктар Маскоўскага дзяржуніверсітэта імя М. Ламаносава Аляксандр Сідаровіч.

ПЕРШЫ прарэктар БДУ Міхаіл Жураўкоў у студзені наведаў Вільнюскі універсітэт і Вільнюскі тэхнічны універсітэт імя Гедзмінаса. З кіраўніцтвам гэтых ВНУ абмеркаваны далейшыя крокі па супрацоўніцтве, у тым ліку ажыццяўленне сумесных міжнародных праектаў у навуковым і адукацыйным кірунках. Да прыкладу, плануецца распрацаваць сумесныя праграмы па выкладанні студэнтам, аспірантам і магістрантам пэўных курсаў на англійскай мове.

ПРАФЕСАР Васіль Стражаў запрошаны для ўдзелу ў Грамадска-кансультацыйным савеце, створаным пры Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Мэта стварэння савета – абмеркаванне актуальных пытанняў развіцця дзяржавы і грамадства, выпрацоўка прапаноў па больш актыўным далучэнні нашай краіны да агульнасусветных працэсаў, удасканаленні кірункаў сацыяльна-эканамічнага і палітычнага развіцця краіны. Узначаліў яго кіраўнік Адміністрацыі Уладзімір Макей.

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**

АФІЦЫЙНА

# АТЭСТАЦЫЯ БДУ

**З 15 па 24 снежня 2008 года ў адпаведнасці з загадам Дэпартамента кантролю якасці адукацыі Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь праходзіла АТЭСТАЦЫЯ Беларускага дзяржаўнага універсітэта.**

У склад камісіі па праверцы дзейнасці БДУ былі ўключаны 44 чалавекі. Падчас атэстацыі быў праведзены кантрольны зрэз ведаў студэнтаў па спецыяльнасцях "Інфармацыя і камунікацыя" (ФФСН), "Кампутарная бяспека" (ФРФЭ), "Паліталогія" (юрфак).

У Заключэнні, падрыхтаваным камісіяй па атэстацыі, адзначаецца, што ў цэлым дзейнасць універсітэта ў галіне адміністрацыйнага кіравання і арганізацыі ўзаемадзеяння структурных падраздзяленняў прызнаная задавальняючай.

Навучальны працэс забяспечаны адукацыйнымі стандартамі, навучальнымі планамі і праграмамі дысцыплін усіх спецыяльнасцяў і вядзецца ў адпаведнасці з нарматыўнымі патрабаваннямі.

У БДУ назапашаны унікальны досвед арганізацыі НДВКР, створаная аб'ёмная навукова-інавацыйная інфраструктура. Структура і форма арганізацыі НДВКР і падрыхтоўкі кадраў вышэйшай кваліфікацыі ў БДУ адпавядае мэтам і задачам, якія стаяць перад ВНУ ў навукова-інавацыйнай сферы.

Універсітэт валодае кадравым патэнцыялам, здольным забяспечыць якасную падрыхтоўку спецыялістаў і высокі ўзровень навуковых даследаванняў і навукова-інавацыйнай дзейнасці. Сярод штатных выкладчыкаў 53,4 % маюць навуковыя званні і ступені.

Матэрыяльна-тэхнічная база ў цэлым, у тым ліку бібліятэчная, інфармацыйная, дапаможная, аздараўленчая, адпавядае патрабаванням, якія прад'яўляюцца да ВНУ універсітэцкага тыпу.

У Белдзяржуніверсітэце створаная і функцыянуе сістэма ідэалагічнай і выхаваўчай работы.

БДУ па сваім кадравым патэнцыяле, адміністрацыйна-арганізацыйнай дзейнасці, матэрыяльна-тэхнічнай, інфармацыйнай і бібліятэчнай базах, стане навучальнай, навукова-даследчай, навучальна-метадычнай, выхаваўчай работы, падрыхтоўцы навуковых кадраў вышэйшай кваліфікацыі ў цэлым адпавядае патрабаванням Законаў Рэспублікі Беларусь "Аб адукацыі", "Аб вышэйшай адукацыі", іншым нарматыўным прававым актам у сферы адукацыі; крытэрыям, якія прад'яўляюцца да ВНУ універсітэцкага тыпу.

**Паводле інфармацыі ГУВНМР**

## ВЕСТКІ З ФАКУЛЬТЭТАЎ

Важнай падзеяй у вывучэнні гісторыі альма-матэр і для БДУ ў цэлым стала *абарона кандыдацкай дысертацыі* па тэме "Уладзімір Іванавіч Пічэта ў навукова-адукацыйных і грамадска-палітычных працэсах Беларусі (1918-1930 гг.)", якая адбылася 22 студзеня. Гэта першае сур'ёзнае навуковае даследаванне, прысвечанае знакавай постаці для нашай ВНУ – яе першаму рэктару.

Суіскальнік навуковай ступені – былая аспірантка гістарычнага факультэта БДУ, а цяпер выкладчык Магілёўскага дзяржуніверсітэта імя А.Куляшова Алена Баранава (навуковы кіраўнік – прафесар Алег Яноўскі).

***

*Міжнародная навуковая канферэнцыя* "Сучасныя матэматычныя метады аналізу і аптымізацыі інфармацыйна-тэлекамунікацыйных сетак" (20-я Беларуская зімовая школа-семінар па тэорыі масавага абслугоўвання) прайшла ў БДУ з 27 па 29 студзеня.

У мерапрыемстве, арганізаваным факультэтам прыкладной матэматыкі і інфарматыкі, прынялі ўдзел навукоўцы з 16 краін.

***

***На ФПМІ БДУ адкрылася чарговая спецыялізаваная навучальная кампутарная лабараторыя.***

Лабараторыя створана ў рамках супрацоўніцтва з беларускай кампаніяй "Адкрыты код", бізнэс-партнёрам вядучых сусветных прадстаўнікоў Linux-рашэнняў. Тут будуць праводзіцца заняткі са студэнтамі па вывучэнні так званых сістэм адкрытых стандартаў, якія свабодна распаўсюджваюцца.

Да нядаўняга часу аперацыйная сістэма *Linux* выкарыстоўвалася энтузіястамі, ды і тое ў асноўным на серверах. Сёння сітуацыя карэнным чынам змянілася. Органы ўлады шматлікіх краін ужо шырока выкарыстоўваюць свабоднае ПЗ або нават абвясцілі пра яго дзяржаўную падтрымку. Сярод іх – Кітай, Францыя, Вялікабрытанія, Германія, Нідэрланды, Японія, Расія і інш. Яго распаўсюджанасць у Еўрасаюзе дасягае 50%. Пры гэтым відавочна, што паспяховае ўкараненне свабоднага ПЗ немагчыма без наяўнасці кваліфікаваных кадраў. Менавіта таму на ФПМІ БДУ і адкрываецца гэтая спецыялізаваная навучальная НДЛ "Свабоднага праграмнага забеспячэння" для вывучэння аперацыйнай сістэмы Linux, праграмных прадуктаў кампаніі IBM (такіх, напрыклад, як Lotus Notes і Tivoli), якія шырока ўжываюцца ў рэальным сегменце IT-рынку.

З ПЕРШЫХ КРЫНІЦ

# ДЗЕЦІ – БУДУЧЫНЯ КРАІНЫ!

***Аб дзяржаўнай дапамозе сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей, у дачыненні да жанчын, што навучаюцца на дзённай форме атрымання адукацыі ў ВНУ і ўстановах паслявузаўскай адукацыі.***

У нашай краіне сістэма дзяржаўнага сацыяльнага страхавання выконвае найважнейшую функцыю па забеспячэнні кожнай застрахаванай асобы пенсіямі і дапамогай. Пры гэтым забеспячэнне здзяйсняецца ва ўсе перыяды жыцця, пачынаючы ад нараджэння дзіцяці.

У адпаведнасці з Законам Рэспублікі Беларусь ад 30.10.1992 г. № 1898-XII "Аб дзяржаўнай дапамозе сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей (у рэдакцыі ад 28.12.2007 г. № 306-З)", сем'і грамадзян Рэспублікі Беларусь, замежных грамадзян і асоб без грамадзянства, якія пастаянна пражываюць у рэспубліцы, маюць права на наступную дзяржаўную дапамогу:

– па цяжарнасці і родах;

– у сувязі з нараджэннем дзіцяці;

– жанчынам, якія сталі на ўлік у дзяржаўных арганізацыях аховы здароўя да 12-тыднёвага тэрміну цяжарнасці;

– па доглядзе за дзіцём ва ўзросце да 3 гадоў;

– на дзяцей, старэйшых за 3 гады;

– па доглядзе за хворым дзіцём ва ўзросце да 14 гадоў;

– па доглядзе за дзіцём-інвалідам ва ўзросце да 18 гадоў;

– па доглядзе за дзіцём ва ўзросце да 3 гадоў і дзіцём-інвалідам ва ўзросце да 18 гадоў – у выпадку хваробы маці альбо іншай асобы, якая фактычна ажыццяўляе догляд за дзіцём;

– некаторых іншых.

***1.* Дапамога па цяжарнасці і родах.**

Права на дапамогу па цяжарнасці і родах маюць жанчыны, якія навучаюцца на дзённай форме атрымання адукацыі ва ўстановах, што забяспечваюць атрыманне вышэйшай і паслявузаўскай адукацыі, а таксама жанчыны, якія скончылі дадзеныя ўстановы адукацыі, – на працягу 2 месяцаў пасля іх заканчэння.

Жанчыны, якія навучаюцца на дзённай форме атрымання адукацыі ў ВНУ і якія сумяшчаюць вучобу з працай, маюць права на дапамогу па цяжарнасці і родах па месцы вучобы і па месцы працы.

Дапамога прызначаецца ў памеры стыпендыі за кожны каляндарны месяц, а тым, хто не атрымлівае стыпендыі, – у мінімальным памеры дапамогі па цяжарнасці і родах.




Мінімальны памер дапамогі па цяжарнасці і родах у месяц усталёўваецца ў памеры 50 % найбольшай велічыні бюджэту пражытачнага мінімуму ў сярэднім на душу насельніцтва, зацверджанага Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь за два апошнія кварталы (далей – найбольшая велічыня бюджэту пражытачнага мінімуму), адносна кожнага месяца адпачынку па цяжарнасці і родах.

З 1.02.2009 г. па 30.04.2009 г. бюджэт пражытачнага мінімуму ў сярэднім на душу насельніцтва ў Рэспубліцы Беларусь складае 234 370 руб.

***2.* Дапамога ў сувязі з нараджэннем дзіцяці.**

Дапамога ў сувязі з нараджэннем дзіцяці прызначаецца і выплочваецца аднаразова:

- пры нараджэнні першага дзіцяці – у памеры пяціразовай найбольшай велічыні бюджэту пражытачнага мінімуму перад датай нараджэння дзіцяці (з 1.02.2009 г. па 30.04.2009 г. памер дапамогі складае 1 171 850 руб.);

- пры нараджэнні другога і наступных дзяцей – у памеры сяміразовай найбольшай велічыні бюджэту пражытачнага мінімуму перад датай нараджэння дзіцяці – 1 640 590 руб.

***3.* Дапамога жанчынам, якія сталі на ўлік у дзяржаўных арганізацыях аховы здароўя да 12-тыднёвага тэрміну цяжарнасці.**

Права на дапамогу маюць жанчыны, якія сталі на ўлік у дзяржаўных арганізацыях аховы здароўя да 12-тыднёвага тэрміну цяжарнасці, рэгулярна іх наведвалі і выконвалі ўказанні дактароў на працягу ўсяго тэрміну цяжарнасці.

Дапамога прызначаецца і выплочваецца аднаразова ў памеры найбольшай велічыні бюджэту пражытачнага мінімуму перад датай нараджэння дзіцяці. З 1.02.2009 г. па 30.04.2009 г. памер дапамогі складае 234 370 руб.

***4.* Дапамога па доглядзе за дзіцём ва ўзросце да 3 гадоў.**

Дапамога па доглядзе за дзіцём ва ўзросце да 3 гадоў з 1.01.2008 г. прызначаецца ў памеры 80 % найбольшай велічыні бюджэту пражытачнага мінімуму. З 1.02.2009 г. па 30.04.2009 г. памер дапамогі складае 187 500 руб.

Пры афармленні дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў ва ўстанову, якая забяспечвае атрыманне дашкольнай адукацыі, дапамога выплочваецца ў памеры 50 %.

Асобы, якія ажыццяўляюць догляд за дзіцём ва ўзросце да 3 гадоў і адн准часова працягваюць навучанне ў ВНУ, маюць права на дапамогу ў памерах, прадугледжаных дадзеным артыкулам, незалежна ад атрымання стыпендыі.

Дадзеная дапамога выплочваецца штомесяц да дня дасягнення дзіцём узросту 3 гадоў.

Днём узнікнення права на дапамогу па доглядзе за дзіцём ва ўзросце да 3 гадоў у студэнтаў з'яўляецца дзень, наступны за днём заканчэння выплаты дапамогі па цяжарнасці і родах.

***5.* Дапамога на дзяцей, старэйшых за 3 гады.**

Дапамога на дзяцей, старэйшых за 3 гады, прызначаецца ў памеры 30 % найбольшай велічыні бюджэту пражытачнага мінімуму.

Дапамога прызначаецца на кожнае дзіця і выплочваецца ў поўным памеры, пры ўмове, што сярэдні сукупны прыбытак на члена сям'і ў месяц за папярэдні каляндарны год не перавышае 60 % зацверджанага бюджэту пражытачнага мінімуму ў сярэднім на душу насельніцтва ў коштах верасня папярэдняга года.

У памеры 50 % дапамогі – пры ўмове, што сярэдні сукупны прыбытак на члена сям'і ў месяц за папярэдні каляндарны год не перавышае 80 % зацверджанага бюджэту пражытачнага мінімуму ў сярэднім на душу насельніцтва ў коштах верасня папярэдняга года.

Студэнты маюць права на дапамогу на дзяцей, старэйшых за 3 гады, у 2009 г. у поўным памеры, калі сярэдні сукупны прыбытак на члена сям'і ў месяц за 2008 г. не перавышае 134 196 рублёў, і ў памеры 50 %, калі сярэдні сукупны прыбытак на члена сям'і ў месяц за 2008 г. не перавышае 178 928 рублёў.

Парадак вылічэння сукупнага прыбытку на члена сям'і пры прызначэнні дапамогі на дзяцей, старэйшых за 3 гады, вызначаецца Міністэрствам працы і сацыяльнай абароны Рэспублікі Беларусь сумесна з Міністэрствам фінансаў Рэспублікі Беларусь.

**Юрый РАБКАВЕЦ,**
начальнік Маскоўскага раённага аддзела Мінскага гарадскога ўпраўлення Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва

*У нашым універсітэце каля 200 студэнтаў маюць дзяцей.*

Матэрыяльную дапамогу са сродкаў уласнага бюджэту ім выдае *студэнцкі прафсаюз.* Ён жа дапамагае маладым сем'ям у набыцці пуцёвак на санаторна-курортнае лячэнне і аздараўленне, арганізуе экскурсійныя паездкі па Беларусі, культурна-масавыя і святочныя мерапрыемствы з выдачай падарункаў. Штомесяц праводзяцца юрыдычныя кансультацыі з удзелам прафсаюзных лідараў і дзяржаўных службоўцаў розных узроўняў. Студэнты ўваходзяць у групы здароўя з выдачай бясплатных абанементаў на наведванне басейна і трэнажорных залаў. Да ўсяго, для сямейных студэнтаў існуе асобны жыллёвы фонд у інтэрнатах.

Акрамя таго, маладыя работнікі БДУ, у адпаведнасці з калектыўным дагаворам паміж адміністрацыяй ВНУ і *прафсаюзам супрацоўнікаў,* маюць магчымасць атрымліваць матэрыяльную дапамогу з агульнауніверсітэцкага фонду ў выпадку шлюбу і нараджэння дзіцяці, а таксама бацькі-адзіночкі, шматдзетныя сем'і і інш.

АСОБЫ

## Пётр ЗАБРЭЙКА: “МАТЭМАТЫКА – НІБЫТА КАРАЛЫ”



***Выбітнаму матэматыку, прафесару кафедры матэматычных метадаў тэорыі кіравання механіка-матэматычнага факультэта БДУ, галоўнаму навуковаму супрацоўніку Інстытута матэматыкі НАН Беларусі доктару фізіка-матэматычных навук Пятру ЗАБРЭЙКУ споўнілася 70 гадоў.***

Семдзесят гадоў – паважны ўзрост, аднак калегі і студэнты ведаюць Пятра Пятровіча як чалавека, заўсёды захопленага працай і новымі ідэямі. Ён ніколі не праміне новую мастацкую кніжку, якая атрымала рэзананс у літаратурных колах, нават калі яна на англійскай мове. Да яго заўсёды прыходзяць па параду не толькі вучні, але і выкладчыкі, бо цэняць Пятра Пятровіча за глыбокія энцыклапедычныя веды амаль ва ўсіх галінах жыцця. Ён умее заўважыць у чалавеку, з якім мае штодзённыя стасункі, здольнасці, талент і падтрымаць гэта. Сам Пётр Пятровіч гаворыць, што яго багацце – гэта ўласная бібліятэка і цікавыя людзі побач.

Пётр Забрэйка – *сусветна вядомы вучоны, яго навуковыя даследаванні ахопліваюць шырокі спектр раздзелаў сучаснай матэматыкі.* Ён з'яўляецца адным з вядучых у свеце спецыялістаў у галіне функцыянальнага аналізу і яго дадаткаў да дыферэнцыяльных і інтэгральных ураўненняў, прыбліжаных метадаў, матэматычных метадаў у эканоміцы і г. д.

Пётр Забрэйка супрацоўнічае з вучонымі Вюрцбургскага, Рурскага універсітэтаў (Германія), Рымскага, Калабрыйскага і Падуанскага універсітэтаў (Італія), універсітэта Лулео (Швецыя). Яго артыкулы выходзяць у прэстыжных міжнародных матэматычных часопісах. Многія з іх падрыхтаваны сумесна з замежнымі калегамі. Пётр Пятровіч з'яўляецца членам рэдкалегіі міжнароднага часопіса па інтэгральных ураўненнях і дадатках “Integral Equations and Applications”, які выдаецца ў ЗША, а таксама членам рэдкалегіі расійскага часопіса “Известия РАЕН”. Пастаянна ўдзельнічае ў выданні сусветна вядомых рэфератыўных часопісаў “Mathematical Review” і “Zentralblatt MATH”. Пётр Забрэйка – удзельнік шматлікіх міжнародных матэматычных канферэнцый, яго неаднаразова запрашалі для чытання лекцый і выступленняў на семінарах у розныя універсітэты і навуковыя цэнтры.

Вынікі навукова-даследчай працы вучонага даюць магчымасць прымяняць матэматыку ў розных галінах прыродазнаўства. Напрыклад, *матэматычная тэорыя адкрытых мадэляў Лявонцьева для адвольных*, якую Пётр Пятровіч развіў, ужо даўно шырока выкарыстоўваецца пры практычным планаванні і ацэнцы дзейнасці як асобных прадпрыемстваў, так і эканомікі ў цэлым. Нездарма пад кіраўніцтвам прафесара і пры непасрэдным яго ўдзеле на механіка-матэматычным факультэце створана *новая спецыялізацыя “Матэматычныя метады ў эканоміцы”*. Прычым ён шмат робіць дзеля таго, каб яна давала студэнтам практычныя веды для вырашэння праблем эканомікі.

Студэнты любяць лекцыі Пятра Пятровіча. Можа, таму, што ён, як сапраўдны вучоны, лічыць за абавязак дзяліцца сваімі вынаходніцтвамі з маладымі. А калі ўспомніць, што прафесар не падзяляе матэматыку і жыццё на асобныя часткі, то і прадмет, які ён выкладае, з яго вуснаў атрымліваецца жывым і захапляльным. Пётр Забрэйка чытае асноўныя курсы функцыянальнага аналізу і інтэгральных ураўненняў, тэорыі імавернасцяў і матэматычнай статыстыкі, метадаў аптымізацыі, тэорыі кіравання, матэматычных асноў эканомікі і г. д. Вялікай папулярнасцю карыстаюцца яго агляднык лекцыі па матэматыцы для студэнтаў V курса, спецыяльныя курсы “Лічбы і прасторы”, “Матэматыка і гісторыя”, “Метадалогія сучаснай матэматыкі” і іншыя.

Пётр Пятровіч ***вызначае матэматыку*** наступным чынам: “Матэматыка ў рэальнасці – гэта не набор гатовых рэцэптаў для рашэння задач і праблем, сабраных у задачніку ці прыдуманых людзьмі, а дом пазнання, які ўзводзіцца пастаянна. Быць матэматыкам не значыць прачытаць многа тоўстых фаліянтаў (хаця гэта і не замінае), а ўмець разабрацца ў сітуацыі, скарыстацца адэкватнай мовай (часта яе трэба проста стварыць), раскрыць механізм аналізаванай з'явы, апісаць яе, “авалодаць” ёю ... Матэматыка аналагічная каралам. Тое, чым уяўляецца матэматыка – наборам тоўстых фаліянтаў, гэта яе ўжо мёртвая частка, як і зараснікі каралаў. А рэальныя матэматыкі занятыя зусім іншым – яны адточваюць метады пазнання прыроды і будуюць матэматычны палац, як жывыя каралы будуюць сваё жытло. Якое мы і называем каралямі ...”

### ДАВЕДКА

П.Забрэйка нарадзіўся 03.02.1939 г. У 1961 г. скончыў матэматычны факультэт Варонежскага дзяржуніверсітэта. У 1964 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю. Па заканчэнні аспірантуры П. Забрэйка працаваў у ВДУ і Інстытуце аўтаматыкі і тэлемеханікі ў Маскве. Створаная ім у гэты перыяд сістэматычная тэорыя аператараў і аператарных ураўненняў у ідэальных прасторах функцый стала асновай для доктарскай дысертацыі, абароненай у 1968 г. (на той момант П. Забрэйка быў самым маладым доктарам фізіка-матэматычных навук у СССР).

У 1971–1981 гг. П. Забрэйка працаваў у Яраслаўскім універсітэце (прафесар, загадчык кафедры, дэкан матэматычнага факультэта, прарэктар па навуцы).

У БДУ Пётр Пятровіч працаваў на пасадах прафесара кафедры функцыянальнага аналізу (1981–1988), загадчыка кафедры матэматычных метадаў тэорыі кіравання (1988–2003), заснавальнікам якой ён з'яўляецца. З 2003 г. на пасадзе прафесара гэтай кафедры.

П. Забрэйка аўтар і сааўтар больш як 10 манаграфій, якія перакладзены на англійскую, нямецкую і польскую мовы, больш за 450 навуковых артыкулаў. Пад яго кіраўніцтвам падрыхтаваны і абаронены 9 доктарскіх і 33 кандыдацкія дысертацыі.

**Ганна ЛАГУН**

АБ'ЯВЫ

### БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ

**аб'яўляе конкурс на замяшчэнне пасад:**

ЗАГАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: лікавых метадаў і праграмавання, агульнага землязнаўства, эканамічнай геаграфіі Беларусі і дзяржаў Садружнасці, фізічнай геаграфіі мацерыкоў і акіянаў і методыкі выкладання геаграфіі, геадэзіі і картаграфіі, эканамічнай геаграфіі замежных краін, псіхалогіі, раманскіх моў, міжнароднага права, фізіялогіі чалавека і жывёл;

ПРАФЕСАРАЎ КАФЕДРАЎ: лазернай фізікі і спектраскапіі, фізікі цвёрдага цела, вышэйшай алгебры, функцыянальнага аналізу, філасофіі культуры, міжнароднага турызму, агульнай экалогіі і методыкі выкладання біялогіі, матэматычнага мадэлявання і аналізу дадзеных;

ДАЦЭНТАЎ КАФЕДРАЎ: вышэйшай матэматыкі і матэматычнай фізікі, тэарэтычнай і прыкладной механікі, тэорыі функцый, функцыянальнага аналізу, геаграфічнай экалогіі, геадэзіі і картаграфіі, паліталогіі, грамадзянскага права, экалагічнага і аграрнага права, сучаснай беларускай мовы, рыторыкі і методыкі выкладання мовы і літаратуры, прыкладной лінгвістыкі, замежнай літаратуры, фізічнага выхавання і спорту, матэматычнага мадэлявання і аналізу дадзеных, вышэйшай матэматыкі, вылічальнай матэматыкі, матэматычнага забеспячэння АСК, тэорыі імавернасцей і матэматычнай статыстыкі, матэматычнага забеспячэння ЭВМ, англійскай мовы і моўнай камунікацыі, сацыялогіі журналістыкі, перыядычнага друку, стылістыкі і літаратурнага рэдагавання;

СТАРШЫХ ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: агульнай фізікі, вышэйшай матэматыкі і матэматычнай фізікі, глебазнаўства і геалогіі, нямецкай мовы, раманскага мовазнаўства, класічнай філалогіі, філасофіі і метадалогіі навукі, фізічнага выхавання і спорту, англійскай мовы эканамічных спецыяльнасцяў, раманскіх моў, малекулярнай біялогіі, заалогіі, біяхіміі, агульнай экалогіі і методыкі выкладання біялогіі, англійскай мовы і моўнай камунікацыі;

ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: экалагічнага і аграрнага права, раманскага мовазнаўства, беларускай літаратуры і культуры, нямецкага мовазнаўства, раманскіх моў, англійскай мовы і моўнай камунікацыі, перыядычнага друку;

АСІСТЭНТАЎ КАФЕДРАЎ: лазернай фізікі і спектраскапіі, заалогіі.

*Тэрмін конкурсу – адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.*

Адрас: 220030, г. Мінск, вул. Бабруйская, 5а, упраўленне кадраў, тэл. 209-54-36.

### ДЗЯРЖАЎНЫ ІНСТЫТУТ КІРАВАННЯ І САЦЫЯЛЬНЫХ ТЭХНАЛОГІЙ БДУ

**аб'яўляе конкурс на замяшчэнне пасады:**

ВЫКЛАДЧЫКА кафедры сацыяльнай работы.

*Тэрмін конкурсу – адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.*

Адрас: г. Мінск, вул. Шпалерная, 7, ДзІКСТ, аддзел кадраў, тэл. 306-00-27.

### ДУА “ІНСТЫТУТ БЕСПЕРАПЫННАЙ АДУКАЦЫІ” БДУ

**аб'яўляе конкурс на замяшчэнне пасады:**

ВЫКЛАДЧЫКА кафедры прыродазнаўства.

*Тэрмін конкурсу – адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.*

Адрас: 220001, г. Мінск, вул. Маскоўская, 15, п. 31, тэл.: 209-59-71.

СУПРАЦОЎНІЦТВА

## МІЖНАРОДНЫЯ СЕРТЫФІКАТЫ CISCO



***У Рэгіянальнай сеткавай акадэміі Cisco БДУ адбыўся выпуск групы сертыфікаваных выкладчыкаў-інструктараў па падрыхтоўцы спецыялістаў самага высокага ўзроўню ў галіне сучасных інфармацыйных тэхналогій.***

Прарэктар па адукацыйных інавацыях і інфармацыйных тэхналогіях БДУ дэкан факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі Павел Мандрык павіншаваў новых інструктараў акадэміі з паспяховым завяршэннем навучання і атрыманнем магчымасці забяспечыць студэнтаў, навучэнцаў і настаўнікаў агульнаадукацыйных школ высокаякаснай сучаснай адукацыяй у галіне сеткавых і інфармацыйных тэхналогій. Ён таксама падзякаваў прадстаўнікам кампаніі Cisco за ўклад у стварэнне Сеткавай акадэміі БДУ і ў падрыхтоўку інструктараў і падзяліўся планамі пашырэння акадэміі за кошт стварэння новых лакальных акадэмій, абсталяваных навучальных класаў і ўвядзення новых навучальных курсаў.

Тэхнічны менеджэр кампаніі Cisco каардынатар праграмы Сямён Аўсяннікаў урачыста ўручыў сертыфікаты інструктарам акадэміі па курсах “Сертыфікаваны Cisco сеткавы спецыяліст” і “Асновы інфармацыйных тэхналогій”. Слухачы акадэміі атрымаюць навыкі ўстаноўкі і канфігуравання камутатараў і маршрутызатараў Cisco ў шматпратакольных сетках, пошуку і выпраўлення непаладак на пачатковым этапе, павышэння прадукцыйнасці і абароненасці сеткі. Пасля праходжання дадзенага курса слухачы будуць падрыхтаваныя да іспыту на атрыманне прамысловага сертыфіката.

### Даведка

Праграма Сеткавых акадэмій Cisco рэалізуецца з 1997 г. Яна мае на мэце фундаментальную падрыхтоўку спецыялістаў па тэорыі і практыцы праектавання, будаўніцтве і эксплуатацыі лакальных і глабальных сетак з выкарыстаннем агульнапрызнаных стандартаў. Акадэміі выкарыстоўваюць электронную мадэль адукацыі (e-learning), якая спалучае Web-навучанне з навучаннем пад кіраўніцтвам выкладчыкаў.

Праграма ў цяперашні час дзейнічае ўжо ў 168 краінах. У Сеткавых акадэміях Cisco, якія працуюць у СНД, зараз навучаецца больш за 3 тыс. чалавек.

**Надзея КЛЕМЯНЦЁНАК**

## БДУ Ў СМІ БЕЛАРУСІ

**Інтэрв'ю з рэктарам БДУ прафесарам Сяргеем Абламейкам: “Ректор БГУ о самом актуальном”** – Интерфакс (06.02); **“А когда было легко поступить в вуз?”** – “Обозреватель” (30.01); **“Фабрика мысли”** – БелТА (28.01); **“Кіраўнік класічнага універсітэта павінен быць не толькі адміністратам, але і выкладчыкам, і навукоўцам”** – “Звязда” (28.01).

**Праект “Універсітэт – твой крок у будучыню”** – “Чырвоная змена”/”Звязда” (06.02).

**Інтэрв'ю з аспіранткай БДУ Маргарытай Фабрыкант (“Уцёкі ад рэчаіснасці: хто ў рыцарскі клуб, хто ў іншыя краіны”)** – “Настаўніцкая газета” (05.02).

**Выпуск выкладчыкаў-інструктараў Рэгіянальнай сеткавай акадэміі Cisco ў БДУ** – БелТА (03.02).

**Дэкан эканамічнага факультэта прафесар Міхаіл Кавалёў каментуе курсы валют (“Еўра/долар: перспектывы канкурэнцыі...”)** – “Звязда” (03.02).

**Круглы стол на ФМА (“Наш выбор – толерантность”)** – “Вечерний Минск” (02.02).

**Дэкан факультэта міжнародных адносін БДУ Віктар Шадурскі разважае пра лёс мігрантаў у Беларусі (“О мигрантах”)** – “Советская Белоруссия” (30.01).

**Як праходзіць першая сесія ў першакурснікаў, на прыкладзе ФПМІ БДУ (“Первый год – он трудный самый”)** – “Минский курьер” (30.01).

**Пра школу юных фізікаў на фізфаку БДУ** – “Настаўніцкая газета” (29.01).

**Студэнцкі саюз БДУ ўзнагароджаны дыпломам Садружнасці студэнцкіх і моладзевых арганізацый СНД** – БелТА (29.01); “Настаўніцкая газета” (03.02).

**Новыя спецыяльнасці ў БДУ** – БелТА (27.01); “Советская Белоруссия” (27.01).

**Свята Новага года па ўсходнім календары ў БДУ** – БелТА (24.01).

**Сустрэча фізікаў-ядзершчыкаў розных пакаленняў на фізфаку БДУ (“Ветераны особого назначения”)** – “Рэспубліка” (22.01).

**Інтэрв'ю з прафесарам БДУ Паўлам Семчанкам (“И руки тянутся к перу...”)** – “Минский курьер” (21.01).

**Пра спектаклі тэатраў БДУ “На філфаку” і “На балконе”** – “Минский курьер” (21.01).

**Інтэрв'ю са студэнткай V курса Інстытута журналістыкі БДУ Ганнай Віскушэнкай (“Зачем нам креативщики?”)** – “Минский курьер” (21.01).

**Спецыяльнасці ФПМІ і мехмата БДУ (“Што значыць быць лепшым праграмістам?”)** – “Настаўніцкая газета” (20.01).

СТУДЭНЦКІ МЕРЫДЫЯН

# ВЭБ-ЖУРНАЛІСТЫКА НА ШВЕДСКІ КАПЫЛ

***Семінар па вэб-журналістыцы пашырыў досвед выкладчыкаў журфака. Студэнтаў чакаюць няпростыя заданні.***

Абмен досведам паміж шведскім Інстытутам павышэння кваліфікацыі журналістаў (FOJO) ды Інстытутам журналістыкі БДУ ідзе ўжо некалькі гадоў. Семінар "Сучасныя кірункі развіцця вэб-журналістыкі", зладжаны згаданымі навучальнымі ўстановамі 26–30 студзеня, стаў другім этапам міжнароднай праграмы "Online journalism".

Калі вы думаеце, што беларуская дэлегацыя з выкладчыкаў і навучэнцаў журфака займела пяцідзённыя вакацыі ў паўднёвым шведскім мястэчку Кальмары, дык памыляецеся. Па інтэнсіўнасці навучання і колькасці новага матэрыялу гэтыя "вакацыі" апынуліся роўнымі курсу якой-кольвек спецыялізаванай дысцыпліны, прынамсі, кожная частка семінара мела дакладную практычную скіраванасць. Так што рыхтуйце нататнікі і ноўтбукі, спадары студэнты новаўведзенай спецыяльнасці "Вэб-журналістыка"! Вам неўзабаве многае давядзецца засвоіць і сеяць на ніве айчыннай журналістыкі.

**Простае відэа, танна і даступна**

Відэа невысокай якасці, знятае з дапамогай непрафесійных камер ці мабільных тэлефонаў, моцна ўздзейнічае на наведніка сайта выдання.

Па-першае, відэа з'яўляецца ў сецїве з мінімальным адрывам ад самой падзеі – з дапамогай адмысловых праграм можна перадаваць зняты матэрыял наўпрост у інтэрнэт-версію выдання, затрымка складае некалькі секундаў. Гэткая апаратыўнасць разам з "жывой камерай" (якая дрыжыць ў руцэ сведкі падзей) стварае эфект прысутнасці, пра які і не марылі найлепшыя рэпарцёры папяровых выданняў, да таго ж амаль выключае магчымасць падробкі ці ангажаванай апрацоўкі.

Па-другое, сам наведнік сайта можа паўдзельнічаць у стварэнні зместу ўлюбёнага выдання – даслаць відэа пра падзею, сведкам якой давялося стаць. Пакуль адбываўся семінар, у Кальмары была скрадзеная машына. Рэдакцыя мясцовай газеты "Barometern" паабяцала тысячу крон (каля ста еўра) за найлепшы матэрыял з месца падзеі – і ў той жа дзень беларусы ў навучальнай аўдыторыі пабачылі затрыманне злачынцы на праектары, падключаным да ноўтбука, што быў далучаны да інтэрнэту.

На думку шведскага выкладчыка і вэб-журналіста Б'ёрна Фалкевіка, простае відэа – наступны крок у развіцці журналістыкі, якая эвалюцыянуе ад звыклай канцэпцыі "Журналісты распавядаюць навіну" да новай – "Мы абмяркоўваем навіну".

*Заданне першае*: зрабіце кароткі рэпартаж з дапамогай мабільнага тэлефона.

*Заданне другое*: праверце, ці працуе Першы нацыянальны тэлеканал з UGC (user generated content), то бок ці ёсць магчымасць (і запатрабаванасць з боку тэлеканала, які імкнецца павялічыць інтэрактыўнасць) загрузіць туды ваша відэа.

**Інфарматыўныя, а не "прыгожыя", загалоўкі**

Інтэрнэт-карыстальнік мае справу з велізарнай плынню інфармацыі, у тым ліку і рэкламнай (прыгадайма пярэстасць любога сайта, ад якой галава кружыцца). Каб ён у гэтай інфармацыі не патануў, а знайшоў патрэбны артыкул, вэб-журналіст павінен карыстальніку дапамагчы, дадаўшы да тэксту (ад якога на галоўнай старонцы зазвычай бачны адно першы сказ) інфарматыўны загаловак, з якога адразу будзе зразумела, што адбылося і чаму пра гэта варта чытаць. Разам з кіраўніком семінара Юнасам Сэдэрстромам яго ўдзельнікі прагледзелі загалоўкі на сайтах вядучых беларускіх выданняў у сецїве і пабачылі, што, хаця на tut.by з'яўляюцца і ўдалыя прыклады, нам яшчэ вучыцца-вучыцца.

Калі паважаны чытач звернецца да пачатку артыкула, ён пабачыць прыменены на практыцы яшчэ адну параду шведскага выкладчыка: не рабіць першы сказ занадта доўгім. Першы сказ – як парог на ўваходзе ў дом, і калі той парог занадта высокі, мала шанцаў, што хтосьці патрапіць усярэдзіну.



Шведскія журналісты ўпэўненыя – пытанне не ў тым, ці знікнуць газеты, а ў тым, калі

**Чытач задаволены, дрэвы цэлыя**

Навошта газеце ўкладваць шалёныя грошы ў рэдызайн сайта? Выкладчык-дызайнер Ён Карлсан цэлы дзень распавядаў беларусам, якія існуюць тыпы карыстальнікаў вэб-рэсурсаў і як на кожны тып уплывае пэўны элемент дызайну сайта. Але адказ на самае цікавае для практычных менчукоў пытанне, як і на пытанне пра патрэбнасць увогуле інтэрнэт-версій выданняў, прагучаў не ў аўдыторыі, а ў рэдакцыі "Barometern", дзе была зладжана сустрэча з кіраўніком вэб-рэдакцыі. Калі госці высветлілі, што інтэрнэт-версія пакуль, нягледзячы на штогадовы рост наведнікаў, стратная, як і ўсе інтэрнэт-выданні Швецыі, за выключэннем сайта самай папулярнай у краіне "Афтонбладэт" (вячэрняя газета таблоідная выгляду), дык наляцелі на таго рэдактара, як пчолы на сочыва. Тут і прагучаў прысуд папяровым выданням: іх знікненне або змяненне да непазнавальнасці не падлягае сумненню. Абмяркоўваеца не тое, ці знікнуць газеты, а тое, калі гэта адбудзецца.

Журналіст з "Афтонбладэт" Гіта Вілен, якая абмалявала ў дзвюх лекцыях перспектывы, магчымасці і рызыкі вэб-журналістыкі, прызналася за кубачкам кавы, што сама больш не чытае ранішніх газет, а праглядае замест гэтага ўлюбёныя старонкі ў сецїве. Для кансерватыўных шведаў, якія (паводле даследавання Шведскага інстытута, праведзенага ў 2006 г.) аддаюць прэсе, радыё і тэлебачанню каля 6 гадзін штодня, гэта проста скандал, а для эколагаў сапраўдны падарунак...

*Заданне першае*: падлічыце, колькі дрэў застанецца некранутымі, калі ўсе газеты Беларусі пяройдуць у электронны фармат.

*Заданне другое*: падлічыце прыбытак кампаніі "Белтэлекам", калі колькасць беларускіх карыстальнікаў інтэрнэту, што зараз складае каля 25% ад насельніцтва, дасягне шведскага ўзроўню ў 80%.

**Маргарыта АЛЯШКЕВІЧ**

НЕ ПРАМІНІЦЕ!

***Студэнты БДУ запрашаюцца да ўдзелу ў V Рэспубліканскім конкурсе творчых работ "Вялікая Айчынная вайна ва ўдзячнай памяці беларускага народа", прысвечаным 65-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.***

Конкурс пройдзе ў 3 туры. Першы – на факультэтах, дзе адбудуцца секцыі агульнауніверсітэцкай канферэнцыі. Работы пераможцаў I тура конкурсу, аформленыя адпаведным чынам, перадаюцца ***да 1 сакавіка*** на кафедру гісторыі Беларусі новага і найноўшага часу (вул. Чырвонаармейская, 6, к. 41, тэл. 227-63-71).

Журы да ***1 красавіка*** вызначыць удзельнікаў заключнага тура Рэспубліканскага конкурсу.

КОНКУРСЫ

# ПЕРАМАГЛІ... АСТРАЎЛЯНЕ!

***Газета "Востраў Юфь" юрыдычнага факультэта БДУ заваявала першае месца і грашовую прэмію ў памеры 800 тыс. руб. па выніках конкурсу на найлепшую студэнцкую малатыражную газету, прысвечаную тэме "2008 – Год здароўя".***

Другое месца і грашовую прэмію ў 650 тыс. рублёў заслужыла газета "ФПМы" факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі. Трэцяе месца падзялілі газеты "Tribune" гістарычнага факультэта і "Вестник мехмата", якія прэміраваны па 500 тыс. руб.

Дыпломы лаўрэатаў атрымаюць рэдкалегіі газет "Содружество", "Новый стиль", "Students Health", а дыпломы ўдзельнікаў конкурсу – "Коллега new", "Nika", "Infocom inside", "Меридиан ГИУСТ", "ФМОп-line", "Хи-хи-химические вести", "ТРИо&здоровье", "2008 – год здоровья" (фізічны факультэт), "2008 – год здоровья" (філалагічны факультэт).

Усяго ў конкурсе бралі ўдзел 16 студэнцкіх малатыражных выданняў.

**Паводле інфармацыі УВРМ**

У ВОЛЬНЫ ЧАС

# ВЯСНУ ГУКАЦІ... КІТАЙСКУЮ!



***Як вядома, у нас існуе традыцыя сустракаць Новы год два разы – 1 і 14 студзеня. Цяпер жа, дзякуючы кітайскай дыяспары, з'яўляецца яшчэ адна нагода. 27 студзеня па ўсходнім календары свята пачатку вясны – "Чуньцзэ".***

"Чуньцзэ" па-кітайску азначае проста "свята", што ўжо само па сабе падкрэслівае значнасць гэтага дня для нашых азіяцкіх сяброў. На яго прынята мазаць вусны мёдам, каб гаварыць адзін аднаму толькі салодкія пажаданні. Упрыгожваць хату чырвонымі ліхтарамі, на вокны вешаць папяровы перавернуты іерогліф, які азначае шчасце. А пасля святочнай вячэры сям'ёй глядзець гала-канцэрт пад выбухі петардаў і хлапушак на вуліцы. Невыпадкова закрадаецца думка, што нашы звычаі чымсьці падобныя...

Пагодзяцца з гэтым меркаваннем і ўдзельнікі святочнага мерапрыемства ў кавярні Інстытута беспераыннай адукацыі БДУ на Маскоўскай, 15, у правядзенні якога дапамагаў Рэспубліканскі інстытут кітаязнаўства імя Канфуцыя. Увечары 27 студзеня тут сабраліся кітайскія і беларускія студэнты, прадстаўнікі кіраўніцтва БДУ, вышэйназваных устаноў, а таксама амбасады КНР у Беларусі, каб разам сустрэць (па ўсходнім календары) вясну.

Дарэчы, у БДУ навучаюцца амаль 800 грамадзян КНР. Кітайскую ж мову вывучаюць больш за 100 нашых суайчыннікаў. У гонар Новага года кітайскія і беларускія студэнты падрыхтавалі канцэрт. Цудоўна праспявала, зразумела, па-кітайску студэнтка ФМА Паліна Доўнар. Здзівіў сваёй арыгінальнасцю танец "Інь і Ян" у выкананні яшчэ адной беларускі пад французскую музыку. Прайшла і прэзентацыя кітайскай кухні: пельмені па спецыяльным рэцэпце, апетытныя лустачкі курыцы ў экзатычным соусе і безліч усяго іншага смачнага.

Было сказана шмат цёплых слоў, а яшчэ адбыўся кранальны абмен падарункамі ...

А ў мяне, беларускай студэнткі, узнікла пачуццё белай зайздрасці. Увявіце сабе, клапатлівыя супрацоўнікі ІБА распрацавалі для кітайскіх студэнтаў спецыяльныя сняданкі, каб яны харчаваліся правільна і менш стамляліся. Нам бы так...

Адчуць кітайскае свята вясны можна было і на выставе "Чуньцзэ", якая працавала ў галерэі "Універсітэт культуры" да 7 лютага. Экспанаваліся працы выпускнікоў 10 мастацкіх акадэмій Кітая, а таксама творы айчынных майстроў.

**Лейла ІСМАІЛАВА**

## АНОНС

Дзень усіх закаханых, самае прыгожае зімовае свята, адзначаецца 14 лютага. У гэты дзень каханым, родным, сябрам безліч разоў можна гаварыць пра свае цёплыя пачуцці. Усім жа заўсёды прыемна глядзець, як прагульваюцца маладыя.

Убачыць творчыя, закаханыя, артыстычныя пары можна будзе **25 лютага ў актавай зале ліцэя БДУ (вул. Ульянаўская, 8), дзе Студэнцкі гарадок праводзіць конкурс "Зорная пара".**

Восем прыгожых пар, прадстаўнікоў інтэрнатаў, памераюцца талентамі. Мерапрыемства праводзіцца ўпершыню. Што менавіта вы ўбачыце на сцэне, пакуль сакрэт. Аднак свята абяцае быць яркім і незабыўным. Прыходзьце падтрымаць сваіх сяброў і апынуцца ў атмасферы кахання і казак!

**Паводле інфармацыі Студгарадка**

УНІВЕРСІТЭТ
Выдаецца з 1929 года
Заснавальнік газеты – Беларускі дзяржаўны універсітэт
Газета ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР
Газета зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Рэгістрацыйнае пасведчанне №149 ад 30 жніўня 2005 года
10 лютага 2009 года
Падпісана да друку 9.02.2009 г.
Зак. 127. Тыраж 2000 экз. Ум. друк. арк. 1.
Надрукавана ў РУП "Выдавецкі цэнтр БДУ"
ЛП № 02330/0056850 ад 30.04.2004.
220030, г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6
Рэдактар Сяргей ШАФАЛОВІЧ
Карэктар Ганна РАК
Адрас рэдакцыі: 220030, Мінск, прасп. Незалежнасці, 4
Прыёмная: вул. Бабруйская, 7, п. 411, тэл. 209-53-45,
e-mail: gazeta@bsu.by; www.gazeta.bsu.by